
Высокае. На днях адбылася раённая нарада рэдактараў насценных газет і рабселькораў газеты „Зара". Прысутныя абгаварылі пытанне аб задачах насценных газет у перыяд агітацыі за кандыдатаў у дэпутаты мясцовых советаў.

На нарадзе выступілі з раскажам аб рабоце рэдкалегій насценгазет рабселькор газеты „Зара", старшыня Расянскага сельсовета тав. Лагвінюк, рэдактар насценгазеты калгаса „Парыжская комуна" тав. Бышко і др.

Дарога Камянец - Белавежа пабудавана

Камянец. (Па тэлефону). Працоўныя сяляне Камянецкага і Гайнаўскага раёнаў падрыхтавалі выдатны падарунак дню выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. У кароткі тэрмін яны пабудавалі дарогу Камянец-Белавежа працягам у 32 кілометры. Выканаў вялікі аб'ём работ: выпута 57.704 кубаметры грунту, вывезена 11.507 кубаметраў камня, пабудаван новы мост працягам у 06 пагонных метраў, забрукавана нанова 11,1 кілометраў шашы, астатняя частка дарогі капітальна адрамантавана.

Будаўнікі дарогі паказалі бліскучыя ўзоры соцыялістычных адносін да працы. Старшы дзесятнік Русяк на сваім участку меў план забрукаваць 2 кілометры дарогі, а забрукаваў 4 кілометры 260 метраў. Рабочыя-камянішчыкі Гірш Лейзер, Гірш Грувін і Вайнарскі Берка выконвалі нормы забрукавання шашы на 180 процантаў. Працоўныя на разбіўцы камня Карнелюк Сцяфан Окуневіч Іван, і Грабенка Барыс, а таксама трамбоўшчык Казакоў Мікалай выконвалі нормы выпраповак на 150 процантаў, трамбоўшчык Федарук Сідар — на 200 процантаў.

Выдатна працавалі землякопы Карнелюк Васіль, Юзляк Казімір, Мышлонік Марыя і Аніта, Яроцкая Вера. Яны на земляных работах выконвалі нормы на 150 процантаў.

Рудзяк, сакратар Камянецкага РК КП(б)Б.

У Высокаўскім раёне слаба разгорнута агітацыйная работа

Па Высокаўскаму раёну закончана рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты мясцовых Советаў дэпутатаў працоўных. Кандыдатамі ў дэпутаты абласнога совета зарэгістраваны старшыня перадовага Воўчынскага сельскага совета, былы палітзняволены тав. Пронька Д. Г., сакратар Брэсцкага абласнога камітэта партыі тав. Дружынін А. І., старшыня раённага выканаўчага камітэта тав. Красненкоў Ф. П.

42 чалавекі лепшых людзей раёна зарэгістраваны кандыдатамі ў дэпутаты раённага совета. Калгаснікі калгаса „17 верасня" вылучылі кандыдатам у раённы совет загадчыка малочна-таварнай фермы, былую батрачку Марыю Вайцехаўну Андрэйчук і старшыню калгаса тав. Мінюк А. В. Сярод кандыдатаў у дэпутаты раённага совета—старшыня Гольскага сельсовета тав. Каротка Ф. І., загадчык Такарскага дома соцыялістычнай культуры малады комсамолец тав. Яшчук А. С., актывістка—сялянка вёскі Агароднікі Анастасія Сцяпанаўна Пентко і др.

Акруговыя выбарчыя камісіі па выбарах у сельскі совет зарэгістравалі кандыдатамі 287 чалавек. 36 чалавек зарэгістраваны кандыдатамі ў Высокаўскі гарадскі совет.

З пачатку выбарчай кампаніі па раёну праведзена 310 сходаў рабочых, служачых і працоўных сялян. На праведзеных сходах працоўныя выказвалі сваю бязмежную любоў і адданасць партыі Леніна-Сталіна і совецкаму ўраду, яны гаварылі аб велізарнейшых правах, якія атрымаў вызвалены народ. Кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых советаў, народ вылуніў лепшых прадстаўнікоў рабочых, сялян і інтэлігенцыі.

Трэба прызнаць, што яшчэ недастаткова разгорнута агітацыйная работа на выбарчых участках, слаба разгорнута агітацыя за выстаўленых кандыдатаў.

Па раёну створана 13 агітколектываў, якія аб'ядноўваюць 490 агітатараў. Рад агітатараў добра спраўляюцца з даручанай работай. Яны нясуць большэвіцкія словы праўды ў масы. Агітатары: настаўнік Івашненка І. Е. і селянін-бядняк Гінчук Максім (Такарскі сельсовет) правялі ўжо па 6 заняткі з выбаршчыкамі па вывучэнню выбарчага закона і Сталінскай Канстытуцыі. Агітколектыў Расянскага сельсовета складаецца з 20 чалавек. Кожны агітатар ужо правёў па 5-7 заняткі. Агітатары вёскі Лясок Ігнацюк М. Г., Ігнацюк А. С., Семянюк С. ужо закончылі ў сваіх гуртках вывучэнне Палажэння аб выбарах і зараз знаёмяць выбаршчыкаў з біяграфіямі кандыдатаў.

Аднак, большасць агітколектываў працуюць слаба. Вось у калгасе „Перамога", Вярховіцкага сельсовета, не арганізавана ні аднаго гуртка па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. А гэты калгас адзін з вялікіх у раёне. Ён аб'ядноўвае 72 гаспадаркі. Адсутнічае масава-агітацыйная работа і сярод сялян вёскі Вулька-Нурэцкая і рада другіх.

Не лепш абстаіць справа і ў горадзе. У швейнай арцелі „Аб'еднанне" працуе 38 чалавек, з якімі за прайшоўшы час праведзены толькі адны заняткі па вывучэнню выбарчага закона. Не працуюць гурткі ў шавецкай і другіх арцелях. Ніякай агітацыйнай работы не праводзіцца сярод выбаршчыкаў, якія пражываюць на Ленінскай, Чырвонаармейскай і Пушкінскай вуліцах.

Не лепш абстаіць справа з агітацыяй ў МТС [illegible] станцыі. [illegible] ёсць свая партыя[illegible] і комсамольская арганізацыі, але ні адзін гурток па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах не арганізаван.

Работнікі аддзела прапаганды і агітацыі РК КП(б)В, кіраўнікі агітколектываў павінны зразумець што там, дзе не працуюць большэвіцкія агітатары, сваю работу могуць праводзіць класава-варожыя элементы, якія ўсякімі метадамі стараюцца сарваць выбарчую кампанію.

Поспех выбараў рашае — умелая пастаноўка агітацыйна-масавай работы на выбарчых участках. Трэба дабіцца таго, каб кожны выбаршчык ведаў — выбарчы закон, Сталінскую Канстытуцыю, ведаў заслугі кандыдатаў перад радзімай, совецкім народам.

І. Муравіцкі.

На раённым комсамольскім сходзе

23 лістапада ў гарадскім клубе мястэчка Сямяцічы адбыўся раённы комсамольскі сход. На парадку дня стаялі два пытанні: задачы комсамольскіх арганізацый у правядзенні выбараў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных і становішча абаронна-масавай работы ў раёне. Прысутнічала каля 200 комсамольцаў.

Даклад па першаму пытанню зрабіў сакратар райкома партыі тав. Казачопак. На канкрэтных прыкладах ён паказаў, як ажыццяўляюцца выбарчыя правы ў краіне соцыялізма і аб бесправі працоўных у капіталістычных краінах. Ён расказаў, каго працоўныя раёна вылучылі кандыдатамі ў дэпутаты мясцовых советаў. У Дзяткавіцкі сельсовет вылучана 25 кандыдатаў. З гэтай колькасці 7 палякаў, 18 беларусаў; беднякоў — 15, сераднякоў — 8 і служачых — 2. Жанчын — 5.

Вялікае месца ў дакладзе тав. Казачопак удзяліў пытанню ўзняцця рэвалюцыйнай пільнасці і непрымірымасці да ворагаў. Класавы вораг будзе імкнуцца ўсімі мерамі падарваць выбарчую кампанію, знясławіць нашых кандыдатаў. Абавязак комсамольцаў даваць рашучы адпор варожым вылазкам. Ён прыводзіць факты, калі асобныя комсамольскія арганізацыі слаба ўдзельнічаюць у агітацыйна-масавай і арганізацыйнай рабоце на участках. Да ліку такіх адносяцца пярвічныя арганізацыі райспажыўсаюза (сакратар тав. Петрашэнь) і Драгічынскай сярэдняй школы (сакратар тав. Шчэрбік).

У спрэчках выступіў сакратар комсамольскай арганізацыі раённай міліцыі тав. Зайцаў. З яго выступлення можна было заключыць, што комсамольская арганізацыя нічога не робіць у справе выбараў. З маючыхся 15 комсамольцаў ні адзін не з'яўляецца [illegible]тарам.

Сакратар комсамольскай арганізацыі калгаса імені Варашылава тав. Рышко расказаў, з якім уздымам сустрэлі [illegible] Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета [illegible] пачатку выбарчай кам[illegible] нас шэсць комсамольцаў, — [illegible] комсамол, нам патрэбна [illegible]мога. Кожны з нас вывучае выбарчы закон і Канстытуцыю і змест прачытанага перадае калгаснай масе. Усе комсамольцы служаць прыкладам для астатніх калгаснікаў, яны лепшыя энтузіясты вытворчасці. Сам. тав. Рышко а красавіка выпрадаваў у калгасе 312 працадзён. На кожны працадзень атрымаў па 6 кілаграмаў зернавых, многа бульбы і грошай. Ён шле шчырую падзяку совецкаму ўраду і комуністычнай партыі за шчаслівае жыццё ў калгасе.

Тав. Іванова (кафельна-плітачны завод № 11) крытыкавала райком комсамола за адсутнасць кіраўніцтва і дапамогі ў рабоце маладых агітатараў. З агітатарамі не праводзяцца семінары. Многія комсамольцы не маюць канкрэтных участкаў для работы.

У прынятым рашэнні па гэтаму пытанню прадугледжана карэннае палепшанне работы комсамольскіх арганізацый у выбарчай кампаніі.

Комсамольскі сход заслухаў даклад сакратара РК ЛКСМБ тав. Шабеткіна аб становішчы абаронна-масавай работы ў раёне. З даклада можна было заключыць, што комсамольская арганізацыя слаба займаюцца гэтай важнейшай справай. З 230 комсамольцаў раёна членамі Асоавіяхіма з'яўляюцца 66, членамі Чырвонага крыжу — 35. Са 167 здаўшых нормы на значок ПВХА аказалася толькі 13 комсамольцаў. Падрыхтоўка значкістаў у раёне зрываецца. Не рыхтуюцца варашылаўскія стралкі. Слаба ідзе работа па падрыхтоўцы значкістаў ППХА і ГСА. Комсамолка тав. Калецкая (арганізацыя медыцынскіх работнікаў) не выконвае даручэння РК ЛКСМБ. Яна не рыхтуе значкістаў ГСА, не гледзячы на тое, што сама з'яўляецца медыцынскім работнікам. Комсамолка Дворкіна (кафельна-плітачны завод № 11) зусім адмовілася рыхтаваць значкістаў.

Выступаючыя ў спрэчках т. т. Дубінскі, Ядранцаў і іншыя адзначалі, што пытанні абаронна-масавай работы ў комсамольскіх арганізацыях не стаяць у цэнтры ўвагі і што райкомам ЛКСМБ не было надана ім належнай увагі.

Сходам прынята па гэтаму пытанню адпаведнае рашэнне.

А. П. Пахамовіч.

У лабараторыі па выпрабаванні будаўнічых матэрыялаў у Мінскім будаўнічым тэхнікуме. Студэнты 2-га курса — выдатнікі вучобы комсамольцы А. А. Юрчанка (злева) і Г. І. Даўгяло пры дапамозе універсальнай машыны вызначаюць моцнасць дрэва.

Вялікая актыўнасць

Працуючы старшынёй участковай выбарчай камісіі, я навольна ўспамінаю недалёкае наша мінулае — выбары ў польскі сейм.

Якая велізарная розніца паміж выбарамі ў былой панскай Польшчы і выбарамі ў совецкай краіне!

Польскія правіцелі нас прымушалі галасаваць за ўгодных ім людзей. Хоць мы і ведалі, што выбіраем не сваіх прадстаўнікоў, але пад націскам і пагрозамі паліцыі, лакеяў буржуазіі вымушаны былі галасаваць. Цёмнае працоўнага чалавека ў былой Польшчы вызначалі правячыя класы — памешчыкі і капіталісты.

Зараз зусім іншае. Мы — гаспадары свайго жыцця і выбіраем сваіх прадстаўнікоў у свой родны орган улады — Совет дэпутатаў працоўных. Гэта добра ўсведамляюць выбаршчыкі, і а вялікай актыўнасцю рыхтуюцца да знамянальнага дня 15 снежня.

Днямі на нашым участку адбыўся сход. Пасля даклада выступалі выбаршчыкі. Яны гаварылі каротка і кожны разумеў прамоўцаў. Выступаўшыя выказалі думкі, і імкненні ўсяго працоўнага насельніцтва, яны гаварылі аб вялікіх правах грамадзян совецкай краіны, аб тым, што [illegible] аддадуць с[illegible] у сталін[illegible] і беспар[illegible] і выступленнем [illegible]дзейнасці выбар[illegible] сустрэлі выдатны [illegible]рны імені Варашылава, [illegible]альны калектыў работнікаў [illegible]ландлю і струнны аркестр цырульнікаў. Толькі ў совецкай краіне, пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі, так пышна квітнеюць народныя таленты.

На наш участак штодзённа прыходзяць выбаршчыкі. Сярод іх можна бачыць хатніх гаспадынь, Жанчыны прыходзяць праверыць, ці занесены яны ў спісы выбаршчыкаў.

Радасна і лёгка становіцца на сэрцы ад таго, што працоўныя ўсведамляюць свае задачы ў надыходзячых выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных і да дня галасавання рыхтуюцца, як да ўсенароднага свята.

З. Эрліх-Муравец,
старшыня Горкаўскай участковай выбарчай камісіі № 2.

Сходы выбаршчыкаў

Днямі адбыўся сход выбаршчыкаў 106 выбарчай акругі па выбарах у гарадскі Совет дэпутатаў працоўных. Прысутнічала 138 чалавек.

Пасля даклада аб Сталінскай Канстытуцыі было наладжана выступленне мастацкай самадзейнасці. Перад выбаршчыкамі выступілі самадзейны калектыў педвучылішча, а таксама асобныя выканаўцы песень і танцаў.

На Тэльмапаўскім выбарчым участку намечана ў бліжэйшыя дні правесці такія сходы па выбарчых акругах № 110 і 111, на якіх кандыдаты сустрэнуцца з выбаршчыкамі.

А. Шобін.

Закончыць будаўніцтва школы

Яшчэ ў маі месяцы ў вёсцы Очкі, Тэльмінскага сельсовета, Брэсцкага раёна, пачата будаўніцтва школы, якое павінна было быць закончана да 15 жніўня. Устаноўлены тэрмін ужо даўно прайшоў, а школа яшчэ не гатова. У ёй не зроблены печы, не абштукатурана столь і цэлы рад другіх недаробак.

Раённы аддзел народнай асветы (загадчык Жукоўскі) не цікавіцца пытаннем заканчэння будаўніцтва школы і не патрабуе ад брыгады цесляроў, з якой заключан дагавор, своечасовага выканання ўзятых абавязацельстваў.

Рака Свіслач з мелкаводнай ператварылася на тэрыторыі будуючагася благаўстроенага возера ў Мінску ў многаводную. Упершыню з'явіўшыся ў сталіцы Беларускай ССР маторны кацер Беласвода робіць цяпер выпрабавальныя рэйсы па Свіслачы

Фота І. Шышко. *Фотахроніка Белта*

Аляксей Андрэевіч Сяргееў

Было хмурае восеньскае падвор'е. Толькі калі-ні калі праз густое воблака выплывала сонца, кідаючы свае ласкавыя мацярынскія прамені на шырокія шыбы акна прасторнага і утульнага пакоя. За сталом, пакрытым чырвоным абрусам, сядзеў Аляксей Андрэевіч Сяргееў, начальнік брэсцкага абласнога ўпраўлення НКУС. На грудзях яго красавалася медаль — узнагарода Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, атрыманая за адвагу перад радзімай. Побач з ім значок дэпутата Вярхоўнага Совета БССР. Ён уважліва разглядаў якіясь паперкі, падкрэсліваючы алоўкам асобныя месцы.

— Таварыш капітан, дазвольце вам перадаць вось гэты дакумент, — паказваючы на паперку, звярнуўся да яго супрацоўнік.

— Калі ласка, — цвёрдым, але ласкавым голасам прамовіў ён.

Вочы начальніка прагна ўпіліся ў паперку, уважліва разглядаючы яе. У кабінеце стала яшчэ больш маўкліва.

— Гэту справу зрабіце вось так, як я вам напісаў.

— Ёсць, — паследваў чоткі адказ.

Аляксей Андрэевіч падняўся з крэсла і, ухіляючыся, запытаў:

— Вы нагадваеце мне.

— Да вас, да вас, таварыш [illegible]

— Да мяне [illegible] знаёмець, будзе[illegible]

— [illegible] Андрэ[illegible]

паўсталі малюнкі жыццёвага шляху гэтага выдатнага чалавека.

* *

1905 год. Па гарадах, мястэчках і сёлах раслі і шырыліся рэвалюцыйныя хваляванні сярод працоўных. Яны хутка ахапілі ўсю краіну. Рабочыя, сяляне, працоўная інтэлігенцыя выступалі супроць сваіх векавых прыгнятальнікаў — памешчыкаў і капіталістаў, за чалавечую будучыню, за шчасце і радасць. Узнімаўся магутны шквал, прадракаўшы буру, здольную змесці з твару зямлі ўсё гнілое, адживаючае. У гэты знамянальны год у сям'і рабочага—змазчыка Серпухоўскай суконнай фабрыкі Андрэя Сяргеева нарадзіўся сын Аляксей. І без таго цяжкае жыццё ў сям'ю прынесла новыя клопаты. Трэба было думаць аб будучыні шостага па ліку сына.

Неўзабаве сям'ю пасцігла няшчасце — гаспадар сям'і Андрэй на фабрыцы атрымаў калецтва.

Фабрыка для [illegible]ючага была тады дамавінай, [illegible] дзень [illegible]сеяла калецтва, [illegible]рць. Фабрыкант Штэйнегер [illegible]лапаціўся аб бязапаснасці жыц[illegible]бочых [illegible] думаў толькі аб [illegible]чк[illegible] атрымаць прыбытку.

Трэба было знах[illegible]

фабрыкі кавалак неўрадлівай зямлі і стаў гаспадарыць. Пракарміцца з яго было цяжка і немагчыма. Вось чаму Андрэю даводзілася часам работаць чорнарабочым на фабрыцы: піліць і калоць дровы, капаць зямлю.

У 1920 годзе, калі краіна залечвала раны, нанесеныя імперыялістычнай і грамадзянскай вайной, малодшы сын Андрэя — Аляксей па наказу бацькі пайшоў работаць малатабойцам у кузню, арганізаваную камітэтам сялянскай беднаты. Пяць год ён работаў у кузні. У 1925 годзе, калі Аляксею споўнілася 20 год, ён пахаў у Ленінград да брата Якава, работаючага на заводзе „Электрасіла". Тут у жыцці Аляксея адбылася радасная перамена. Яго, юнака, з адукацыяй 4-х класаў пачатковай школы завод накіраваў на вучобу ў інстытут працы. Праз шэсць месяцаў яму давялося нетолькі вучыцца, але і работаць на заводзе электраабсталявання. Вясной 1927 года Аляксей скончыў інстытут і атрымаў назначэнне на завод „Электрасіла". Работаць тут давялося ўсяго 4—5 месяцаў.

Восенню ў жыц[illegible] Аляксея [illegible] радасць — [illegible] прызвалі [illegible]ных воінаў Рабоча—[illegible]арэнай Арміі. На [illegible]у Цімашэвіцкі пагр[illegible] [illegible]лужбаўна вельмі [illegible] Аляксей добра [illegible]раніцу пасылах. Граніца для [illegible]шкоўлай, выхоўваючай мужнасць і ўменне распазнаваць няпрошаных „гасцей" з былой панскай Польшчы. У пагранатрадзе ён скончыў школу малодшых камандзіраў. Камандванне даручыла яму адказную справу. Спачатку ён работаў камандзірам аддзялення, потым памочнікам камандзіра ўзвода.

У 1929 годзе яго, як лепшага сына працоўнага народа, партыйная арганізацыя пагранатрада прыняла членам у рады вялікай партыі Леніна—Сталіна. Перад дэмабілізацыяй з пагранвойск на імя камандвання Аляксей напісаў рапарт. У ім ён прасіў камандванне пакінуць яго служыць у слаўных органах НКУС. Просьба была задаволена. Ён атрымаў назначэнне на службу ў Барысаўскае гарадское ўпраўленне НКУС. Спачатку быў фельдегерам, потым памочнікам аперупаўнаважанага. У 1934 годзе атрымаў новае назначэнне — работаць намеснікам начальніка палітаддзела саўгаса „Прывольле", Клімавіцкага раёна, па аператыўнай рабоце. Праз год быў пераведзен у саўгас „Комунар" Уваравіцкага раёна на гэту-ж пасаду.

З 1936 па 1939 год Аляксей Андрэевіч работае на розных работах, пачынаючы ад аперупаўнаважанага і да начальніка аддзела наркамата ўнутраных спраў БССР. Разам з гераічнай Чырвонай Арміяй, прынёсшай шчасце і радасць працоўным Заходняй Беларусі, прыбыў і тав. Сяргееў у гор. Брэст. Спачатку ён работаў начальнікам пашпартнага аддзела НКУС, а пры арганізацыі вобласці начальнікам абласнога аддзела [illegible]

Тав. Сяргееў з'яўляецца дастойным сынам соцыялістычнай радзімы. Совецкая ўлада і партыя Леніна-Сталіна выхавалі з яго выдатнага патрыёта, поўнага гарачай любві да свайго народа і лютай нянавісці да ворагаў. Усюды, дзе-б ні работаў Аляксей, ён апраўдваў і апраўдвае высокую назву члена вялікай партыі большэвікоў. Тав. Сяргееў з'яўляецца членам рэвізійнай камісіі ЦК КП(б)Б, членам бюро абкома партыі і членам прэзідыума аблвыканкома. Рабочыя, служачыя, інжынерна-тэхнічны персанал Ружанскага райпромкамбіната аказалі яму вялікае давер'е, аднадушна вылучылі кандыдатам у дэпутаты абласнога совета.

На правядзімых сустрэчах са сваім кандыдатам рабочыя і працоўныя сяляне выказвалі сваю радасць.

— Для нас вялікае шчасце, — гаворыць выбаршчык Сонка, — свабодна галасаваць за лепшых людзей народа. Я ўпэўнен, што 15 снежня ўсе выбаршчыкі аддадуць свае галасы за кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных — Аляксея Андрэевіча Сяргеева.

Гэта былі словы, выказваючыя думку ўсіх выбаршчыкаў, вылучыўшых сваім кандыдатам слаўнага сына нашай радзімы.

Г. Пайвін.

Дзеці пагранічнікаў Забайкальскай ваеннай акругі Т. Булыгіна (злева) і А. Вокач, якія здалі нормы на тры абаронных значкі.
Фота Я. Рукава. *Фота ТАСС.*

Перадавікі абаронна-масавай работы

У Толвінскай НСШ, Журобіцкага сельсовета, Сямяцінскага раёна добра арганізавана абаронна-масавая работа сярод піонераў і школьнікаў.

У школе падрыхтаван 21 значкіст ПІХА з вучняў старэйшых класаў. Усе яны атрымалі значкі. Зараз рыхтуецца яшчэ 25 значкістаў ПІХА. Гэтым гурткам кіруе старшы піонерважаты школы тав. Краснабаеў.

Створаны гаксама гурткі ВС, ЮВС, у якіх займаецца 75 вучняў. Гурткамі кіруюць настаўнікі.

Становучае і тое, што ў школе ўсе вучні ўцягнуты ў гурткі, яны рыхтуюцца да абароны сваёй радзімы. **А. Пахамовіч.**

Словы мацеры

Дамачэўскі раённы выканаўчы камітэт выдаў за гэты год вялікую суму грошай дзяржаўнай дапамогі многадзетным мацерам. Надаўна дзяржаўную дапамогу — 4 тысячы рублёў, атрымала сялянка-бяднячка, з вёскі Падлужная Петрачук Ф. А. Атрымліваючы грошы яна заявіла:

[illegible] дзяўлення совецкай [illegible] краі мае дзеці [illegible] хлеб, мы жылі ў [illegible] дзе. У мінулым [illegible] ўлады мы атры- [illegible] зараз не [illegible] совецкай [illegible] ніколі не [illegible] фічыра дзякую таварышу [illegible] за клопаты аб нас, многадзетных мацерах. **Гутэрман Геня.**

Дзе-ж памыцца?

(Пісьмо ў рэдакцыю)

У раённым центры Шарашова ёсць прасторная лазня. Шесць месяцаў таму назад яе пачалі рамантаваць, але і да гэтага часу не закончылі.

Больш 5 тысяч чалавек не маюць магчымасці памыцца, а гэта ніколькі не турбуе раённы кіруючы арганізацыі. **Н. Мут.**

Ушанаванне памяці А. Міцкевіча

Урачыстае пасяджэнне ў калонным зале Дома саюзаў

26 лістапада ў 85 гадавіну з дня сморці вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча ў Калонным зале Дома саюзаў адбылося ўрачыстае пасяджэнне, створанае Прэзідыумам Саюза Совецкіх пісьменнікаў СССР. Сярод сабраўшыхся — пісьменнікі, вучоныя, артысты, байцы і камандзіры Чырвонай Арміі, прадстаўнікі фабрык і заводаў, студэнцкая моладзь сталіцы.

У прэзідыуме — рускія, польскія, украінскія і азербайджанскія пісьменнікі: А. Фадзееў, Ванда Васілеўская, Мікола Бажан, Самед Вургун, Янка Купала, П. Пауленка, А. Твардоўскі, В. Вішнеўскі, В. Катаеў, В. Верасаеў, Ф. Панфёраў і іншыя.

Вечар адкрыў уступным словам сакратар Прэзідыума Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР таварыш А. Фадзееў.

Ахарактарызаваўшы паэзію Міцкевіча, на працягу дзесяцігоддзяў падвяргаўшуюся скажэнням і ілжэталкаванням буржуазных нацыяналістаў, таварыш Фадзееў гаворыць:

— Рускаму народу імя Міцкевіча асабліва дорага таму, што ў гісторыі рускай літаратуры яно цесна пераплятаецца з іменем Пушкіна. Паэзія іх узаемна абагачала друг друга, яны пакінулі памяць аб сваёй дружбе ў бясмертных вершах.

Даклад аб жыцці і творчасці Міцкевіча зрабіла т. Е. Усіовіч.

Затым выступіў народны паэт Беларусі Янка Купала.

У мастацкай частцы вечара прынялі ўдзел відныя майстры мастацтваў сталіцы. Былі выкананы творы Міцкевіча і музыкальныя творы, напісаныя на тэкст паэта.

Закончан альпінісцкі сезон

ФРУНЗЕ. У гарах Тянь-Шаня і Кіргізскага Ала-Тау выпаў [illegible] бокі снег. Альпінісцкі сезон закончан.

У гэтым годзе альпіністы Кіргізіі ўзялі 5 горных пікаў, на якія да гэтага часу не ступала нага чалавека. У часе аднаго з высокагорных усходжанняў майстар спорта В. Рацэк абнаружыў на ўсход ад Хан-Тэнгры вяршыню не нанесеную яшчэ на карты. Прыблізная вышыня яе 6.000 метраў.

564 чалавекі здалі нормы на значок „Альпініст СССР" першай ступені.

Новая форма вопраткі для работнікаў марскога [illegible]

МАСКВА. [illegible] народнага Камісара [illegible] га флота СССР [illegible] жага з 1 студзеня тав. С. Дука[illegible] ютнікаў мар[illegible] 1941 года для [illegible] флота ўводзіцца новая [illegible] вопраткі і знакі различя[illegible] формы абавязкова пры выкананні службовых абавязкаў.

Дэлегацыі брацкіх рэспублік у Арменіі

ЕРЭВАН. Дэлегацыі брацкіх рэспублік, удзельнічаўшыя ва ўрачыстасцях, прысвечаных дваццацігоддзю Арменіі, наведалі Севанскі, Вагаршапацкі, Камарлінскі раёны. Яны знаёміліся з помнікамі старажытнай культуры армянскага народа. (ТАСС).

Прэмьера оперы „Трыльбі" у Дзяржаўным ордэна Леніна вялікім тэатры оперы і балета БССР. **На здымку:** фінал оперы. У ролі Свенгелі — артыст В. І. Таланкін, у ролі Трыльбі — заслужаная артыстка БССР В. М. Малькова.

НОВАЯ БАЛЬНІЦА

За час совецкай улады ахова здароўя працоўных горада Бреста значна палепшылася. Гэта дастаткова ярка пацвярджае адкрыццё трэцяй гарадской бальніцы.

Раней, пры ўладзе польскіх паноў, працоўнаму чалавеку не было даступна медыцынскае абслугоўванне. За лячэнне трэба было плаціць на два тыдні ўперад. Бывалі такія выпадкі, калі хворыя, чакаючы ў калідорах дазволу на прыём іх у бальніцу, там-жа паміралі.

Новая трэцяя бальніца ярка сведчыць аб вялізных клопатах партыі і совецкага ўрада аб здароўі працоўных. Бальніца абсталявана па апошняму слову тэхнікі. Прасторныя і светлыя палаты, цэнтральнае атапленне, радыёнавушнікі ля кожнага ложка хворага. Усё новае, чыста, утульна. Бальніца ўкамплектавана добрымі [illegible] лістамі. У ёй бясплатна атрымоўваюць лячэнне працоўныя горада і вёсак.

Д. Мееровіч, м[illegible]дзінская сястра трэцяй гарадской бальніцы.

Зборныя [illegible] для індывідуальн[illegible] [illegible]аўніцтва

НОВАСІБІР[illegible] [illegible]дзехах шыр- [illegible]га вы- [illegible]рабляюцца [illegible] Дом індывідуа[illegible] —ад[illegible] [illegible]коямі, [illegible] верандай. [illegible] квадратных мет- [illegible] — 5.000 рублёў. [illegible]век збіраюць дом за во- [illegible]дзён.

[illegible] Магочны пабудавана [illegible]кіх дамоў.

(ТАСС).

[illegible]цейшыя месца- [illegible]аджэнні азбеста

[illegible]ЦК. У Бурат-Мангольскай АСС[illegible] экспедыцыя прамысловага трэс[illegible] нерудных выкапняў адкрыла багацейшыя месцанараджэнні азбеста. Валокны азбеста дасягаюць даўжыні да 80 міліметраў. — Гэта — самы лепшы гатунак азбеста, з яго ткуць неагараемыя касцюмы. (ТАСС).

Прыём тт. Собалева і Лаўрышчава балгарскім царом Барысам і прэм'ер-міністрам Філавым

САФІЯ, 26 лістапада (ТАСС). Учора днём генеральны сакратар Народнага Камісарыята Замежных Спраў тав. Собалеў у суправаджэнні паўпрада СССР у Сафіі тав. Лаўрышчава наведаў прэм'ер-міністра Балгарыі прафесара Філава. У 5 гадзін 30 мінут вечара тт. Собалеў і Лаўрышчаў былі прыняты царом Барысам.

Усе сёнешнія газеты на першых старонках публікуюць паведамленне аб прыёме, а таксама змяшчаюць партрэты таварышаў Собалева і Лаўрышчава.

Да прабывання ў Сафіі балгарскага пасланніка ў Берліне Драганава

БЕРЛІН, 26 лістапада. (ТАСС). Як перадае Германскае інфармацыйнае бюро з Сафіі, балгарскі пасланнік у Берліне Драганаў прыбыў у Сафію для даклада. Сёння Драганаў, як відаць, будзе прыняты прэм'ер-міністрам Балгарыі Філавым і міністрам замежных спраў Пановым. Затым мяркуецца прыём Драганава царом Барысам. Прабыванне Драганава ў Сафіі знаходзіцца ў цэнтры ўвагі. У сувязі з тым, што балгарскія дзяржаўныя дзеячы ў сучасны момант не паедуць у Берлін, распаўсюджаліся чуткі, што Драганаў прывязе асабіста пратакол аб далучэнні Балгарыі да пакта трох дзяржаў для падпісання яго на месцы. У добра інфармаваных кругах, аднак, гэта абвяргаецца спасылаючыся на тое, што гэта пытанне ў сучасны момант не з'яўляецца актуальным.

Германскае абвяржэнне

БЕРЛІН, 26 лістапада (ТАСС). Як перадае Германскае інфармацыйнае бюро, у палітычных кругах Берліна заяўляюць, што паведамленні некаторых нью-йоркскіх газет аб новым „мірным наступленні" Германіі (гэта значыць аб падрыхтоўваемых ёю мірных прапановах) з'яўляюцца вымыслам.

Французскія газеты патрабуюць аддання суду Лебрэна

НЬЮ-ЙОРК, 26 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню „Нью-Йорк геральд трыбюн" французскія газеты патрабуюць аддання [illegible]наму суду былога прэзідэнта Францыі [illegible]брэна за перашучасць і бяздзейна[illegible]

З ленты тэлеграфа

Асенняя паводка ў Дрынскай банавіне (адна з пладароднейшых абласцей Югаславіі) дасягнула надзвычайных ра мераў. Пад вадой звыш 5.000 гектараў зямлі. Затоплена 600 дамоў, згінула многа жывёлы, знішчана вялікая колькасць прадуктаў і кармоў.

* * *

Агенцтва Рэйтэр перадае, што ў гэтым годзе ў Англіі не будуць праводзіцца раждэственскія святы. Тое-ж самае адносіцца да Шатландыі, Уэльса і Паўночнай Ірландыі.

Англа-германская вайна

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 26 лістапада. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, на працягу ўчарашняга дня невялікаму злучэнню германскіх бамбардыроўшчыкаў удалося прарвацца да прадмесця Лондана. Незадоўга да наступлення цемры непрыяцельская авіяцыя зрабіла налёт на горад, які знаходзіўся на ўзбярэжжы графства Кент. У рэзультаце бамбардыроўкі разбурана некалькі дамоў і ранена нязначная колькасць людзей. Бомбы былі скінуты германскімі самалётамі на горад у раёне паўднёвага ўзбярэжжа Англіі, а таксама на два другіх у Паўднёва-Усходняй Англіі. Матэрыяльныя страты нязначныя. Афяр не было. Адзін непрыяцельскі бамбардыроўшчык збіт.

Другі раз з часу масавых налётаў германскай авіяцыі на Англію ў Лондане, пачынаючы з паўночы, не было аб'яўлена ні адной паветранай трывогі.

У ночы на 26 лістапада англійскія гарматы праз Па-да-Кале абстралялі германскія артылерыйскія батарэі на французскім узбярэжжы. Германскія гарматы, устаноўленыя паблізу мыса Грыс Нэ, адкрылі адказны агонь.

Як паведамляе англійскае міністэрства авіяцыі, цяпер стала вядомым, што ў ночы на 26 лістапада некалькі бомб скінута ў Заходняй Англіі. Бамбардыроўкай прычынены невялікія страты. Акрамя гэтага, у ночы на 26 лістапада над Англіяй не адзначана больш ніякой дзейнасці непрыяцельскай авіяцыі.

Англійскія самалёты ў ночы на 26 лістапада бамбардыравалі доки двух партоў Паўночна-Заходняй Германіі.

ЛОНДАН, 26 лістапада. (ТАСС). У камунікаце камандвання англійскіх паветраных сіл, апублікаваным у Каіры 25 лістапада, гаворыцца, што ў Заходняй пустыні англійская авіяцыя зрабіла налёты на Дэрну, Апалонію, Тобрук і Бардзію. У Дэрне і Апалоніі бомбы былі скінуты на казармы. Пры бамбардыроўцы Тобрука пашкоджаны збудаванні ваеннага характару. У Бардзіі пашкоджан адзін непрыяцельскі самалёт. Усе англійскія самалёты вярнуліся на свае базы.

У Італьянскай Усходняй Афрыцы англійская авіяцыя зноў бамбардыравала Асаб, а таксама казармы ў Азозе і ваенны лагер у Салейе. Акрамя таго, быў зроблен паспяховы налёт на Губу.

24 і 25 лістапада непрыяцельскія самалёты зрабілі два налёты на Мальту.

Англійская зенітная артылерыя адкрыла інтэнсіўны агонь. Самалёты праціўніка абмежаваліся кулямётным абстрэлам аэрадрома. Прычынены нязначныя пашкоджанні, афяр няма.

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 26 лістапада. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае зводку вярхоўнага камандвання германскай арміі:

Германская падводная лодка патапіла непрыяцельскія судны водазмяшчэннем у 41.400 тон. У ночы на 25 лістапада германская авіяцыя зрабіла налёты на Лондан. У цэнтры горада ў раёнах па абодвух берагах Тэмзы адзначаны вялікай сілы ўзрывы і пажары. Другія злучэнні бамбардыроўшчыкаў у тую-ж ночы бамбардыравалі ваенныя аб'екты Брыстоля. Знішчана вялікая колькасць складаў сыравіны і прадпрыемстваў. У рэзультаце бамбардыроўкі знішчаны таксама тры газавых заводы. Далейшай бамбардыроўцы падвергліся ў гэтую-ж ноч некалькі гарадоў Цэнтральнай і Паўднёвай Англіі. У сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я дзейнасць авіяцыі на працягу ўсяго дня 25 лістапада была нязначнай. Невялікія злучэнні лёгкіх бамбардыроўшчыкаў паспяхова атакавалі розныя важныя ў ваенных адносінах аб'екты ў Паўднёвай Англіі, скінуўшы бомбы.

Дальнабойныя батарэі палявой і марской артылерыі абстралялі 25 лістапада вечарам адзін англійскі караван суднаў, спрабаваўшых прарвацца к заходняму выхаду Ла-Манша. Караван суднаў быў рассеян.

На працягу ўчарашняга дня непрыяцель страціў 2 самалёты. З германскага боку страт не было.

Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што ў сувязі з распаўсюджваемымі англійскімі радыёстанцыямі чуткамі аб меў шай месца ў ночы на 24 лістапада бамбардыроўцы вакзалаў Берліна замежныя карэспандэнты, а таксама ваенныя аташэ раду дзяржаў агледзелі ўчора вакзалы і месцы, з'яўляўшыяся, па сцвярджэнню англійскага радыё, аб'ектамі бамбардыроўкі. Журналісты і ваенныя аташэ, якія наведалі Путлінд-штрасе, Лерускі, Потсдамскі вакзалы, не знайшлі ніякіх слядоў бамбардыроўкі. Вакзалы работалі нармальна.

ВАЙНА ПАМІЖ ГРЭЦЫЯЙ І ІТАЛІЯЙ

НЬЮ-ЙОРК, 26 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Асошыэйтэд Прэс, у апошнім камунікаце вярхоўнага камандвання грэчаскіх узброеных сіл гаворыцца, што грэчаскія войскі, працягваючы наступленне, занялі некалькі новых пазіцый.

У камунікаце міністэрства грамадскай бяспекі паведамляецца, што італьянскія самалёты зрабілі налёт на грэчаскія гарады і вёскі ва ўнутранай частцы краіны. Бамбардыроўцы падвергліся Ліксурыон і Аргостоліон (востраў Кефалінія), горад Корфу і некалькі вёсак на востраве Корфу, а таксама некалькі вёсак у раёне Эпіра і другіх частках краіны.

Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, усяго грэкамі ўзята ў палон 7.000 італьянцаў.

НЬЮ-ЙОРК, 26 лістапада. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Асошыэйтэд Прэс, грэчаскія войскі уступаюць на ўкраіны Аргірокастрона. Цяжкія баі адбываюцца на паўднёвы захад ад Аргірокастрона, дзе грэкі працягваюць адразаць адступаючыя італьянскія войскі. У цэнтральным сектары італьянскія войскі пакінулі свае ўмацаваныя пазіцыі на гары Остовіцы. У раёне Паграбеца грэчаскія кавалерыйскія часці праследуюць адступаючыя італьянскія войскі.

У грэчаскіх кругах заяўляюць, што страты як у грэчаскай, так і ў італьянскай арміях параўнальна невялікія. Грэчаская авіяцыя бамбардыравала ў Албаніі Берат, Эльбасян і Тэпелене.

Калона грэчаскіх войск, прасоўваючыхся з Корчы, захапіла 200 італьянскіх грузавікоў і розныя ваенныя матэрыялы ў раёне Паграбеца. Узята ў палон некалькі сот італьянцаў.

Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, грэчаскі друк сцвярджае, што большая частка італьянскай лініі абароны на паўночным беразе ракі Дэвол разбурана. Грэчаскія войскі ўступілі ў Паграбец.

Зводка італьянскага камандвання

РЫМ, 26 лістапада. (ТАСС). Італьянскае камандванне паведамляе: „На грэчаскім фронце атрады праціўніка, высадзіўшыяся на ўзбярэжжы Эпіра, былі часткова знішчаны, часткова ўзяты ў палон разам са сваёй зброяй. Наша авіяцыя зрабіла шматлікія атакі ва ўсёй зоне аперацый, неаднаразовай бамбардыроўцы падвергліся ўмацаванні вострава Корфу. У раёне Дурацо нашы знішчальнікі збілі 2 непрыяцельскіх самалёты.

Авіяцыя праціўніка зрабіла налёты на астравы Лерос і Стампалія (Дадэканезскія астравы). Пашкоджана некалькі будынкаў. Забітых і раненых няма. Збіта 6 самалётаў праціўніка.

Непрыяцельскія самалёты скінулі бомбы на Асаб; ёсць адзін забіты і 4 раненых. Матэрыяльныя страты нязначныя".

Адказны рэдактар Г. Ф. Мінчукоў

УЗНЯЦЬ І ВЫПРАВІЦЬ НЕДАХОПЫ

[illegible] школ не наладжана [illegible]дня па асобных прадмета[illegible]

[illegible] на ніякі процант паспяхо[illegible] выпадае на рускую і белару[illegible] мовы. Для выкладання [illegible] прадметаў патрабуецца [illegible] гібкасць. Паміж іншым [illegible] беларуская мовы многімі [illegible]камі выкладаецца схала- [illegible], адсутнічае жывасць, [illegible] планіруецца ўрок.

[illegible] праводзяцца сумна, не прыцягваецца любоў да чытання. Расказваюць дзеці манатонна, цягуча, а многія настаўнікі іх не папраўляюць. Так, напрыклад, у настаўніцы рускай мовы 14 НСШ тав. Раготнер вучні не ўмеюць дэкламіраваць. У настаўніцы 10 НСШ Грозбад на ўроку вучні займаюцца пабочнымі справамі, бо педагог не можа зацікавіць вучняў. Указаная настаўніца „ухітрылася" тэму — „паняцце аб аснове слова" паўтарыць на працягу 38 мінут, а новы матэрыял на тэму корань і суфіксы, прыстаўкі, канчаткі растлумачыла за 4 мінуты. На замацаванне задання на дом не засталося на гэтым уроку ў настаўніцы часу. Зусім не дзіўна, што і вусны па рускай мове не высокія. Віды пісьмовых работ па ўсіх мовах выкладання амаль адноўкавы. Залюбленым відам да гэтага часу з'яўляецца кантрольны дыктант.

А чаму-б не прымяняць творчай работы. Пісанне творчых работ, апісальнага і апавядальнага характару, куды лепш могуць захапіць вучняў, чымся кантрольны дыктант. Кантрольны дыктант павінен прымяняцца толькі тады, калі ўсё зроблена для дасягнення правільнага напісання гэтага дыктанта.

Перагрузка ўрокаў, дрэнная планіроўка, адсутнасць актывізацыі метадаў на ўроку — адказ на прычыны нізкай паспяховасці.

Настаўніцкімі калектывамі не прыцягнуты бацькі для дапамогі школе. А бацькі змаглі-б аказаць вялікую дапамогу настаўнікам у паляпшэнні вучэбна-выхаваўчай работы.

Намі яшчэ дрэнна выкарыстоўваецца вопыт лепшых настаўнікаў. Работа прадметных секцый яшчэ нездавальняючая. Адкрытыя ўрокі не дасягаюць яшчэ сваёй асноўнай мэты.

Нельга здымаць адказнасці за паспяховасць і з саміх вучняў. Сярод рэбят ёсць такая катэгорыя, якая не жадае вучыцца. Да такіх патрэбна прымаць меры ўздзеяння і школай і бацькамі. Аднак сярод вучняў ёсць і такія, якія жадаюць вучыцца, але з'яўляюцца адстаючымі па таму або іншаму прадмету. Такім рэбятам патрэбна аказаць дапамогу, прымацаваць да іх настаўнікаў, арганізаваць [illegible]таны.

Выхаваўчая работа на [illegible]пінна быць неад'емлем[illegible] чэбнага працэсу. Гэта [illegible]чыць і паспяховасць вучн[illegible] дыме якасць работы. Антр[illegible]нае, інтэрнацыянальнае выхаванне павінна быць умела ўвязана ў ходзе самаго ўрока. Гэта зусім не значыць, што патрэбна праводзіць выхаваўчыя моманты там, дзе гэта немагчыма. А ў нас ёсць такія выпадкі.

Настаўнік 7 НСШ Ківаль, расказваючы аб Джаардано Бруно, зусім не застанавіўся на жудасцях царкоўнай інквізіцыі, якая бязлітасна знішчала каштоўныя навуковыя адкрыцці. Гэта дапамагло-б выкрыць сапраўдную класавую сутнасць духавенства і рэлігіі.

Антырэлігійнае выхаванне ў школах носіць яшчэ кампанійскі характар. Не арганізаваны навуковыя гутаркі аб паходжанні жыцця на зямлі і чалавека.

У школах мала займаюцца пытаннем прывіцця культурных навыкаў вучням. Не праводзяцца гутаркі аб ветлівасці, чэснасці, комуністычнай маралі.

У другой вучэбнай чвэрці ў цэнтр увагі патрэбна паставіць барацьбу за добраякасную арганізацыю вучэбнага працэсу, належную арганізацыю ўрока, за ўмацаванне дысцыпліны, без чаго не можа быць належнай паспяховасці. Патрэбна арганізаваць [illegible]

Абласное Упраўленне Аўтатранспарта паведамляе, што з 28.XI.1940 г. пачынаюць работаць [illegible]

Адрэс рэдакцыі г. Брэст, вуліца імені Карла Маркса 29. Тэлефоны: адказнага рэдактара — 1-17, [illegible]